ДУК “Карэліцкая раённая бібліятэка”
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

# Знамянальныя і памятныя даты краязнаўчага календара Карэліцкага раёна

## на 2019 год

Карэлічы, 2018

# *Прадмова*

Краязнаўчы каляндар на 2019 год падрыхтаваны на аснове “Спісаў знакамітых людзей Карэліцкага раёна”, даных архіва Карэліцкага ЗАГСа, краязнаўчай картатэкі Карэліцкай раённай бібліятэкі, фонда УК “Карэліцкі раённы краязнаўчы музей” і іншых крыніц.

Адбор юбілейных дат рабіўся ў адпаведнасці са значнасцю для гісторыі, эканомікі і культуры краю.

Дадзенае выданне дапаможа супрацоўнікам бібліятэк, клубаў і музеяў у арганізацыі работы, а таксама будзе карысны краязнаўцам і шырокаму колу чытачоў.

## У 2019 годзе спаўняецца:

**30 год** з часу першага прадстаўлення народнага лялечнага тэатра “Батлейка” установы адукацыі **“Мірскі дзяржаўны мастацкі прафесійна – тэхнічны каледж”**

**45 год** з часу заснавання **ААТ “Карэлічы – лён”**(г.п. Карэлічы;   1974 г. ).

**100 год** з дня нараджэння беларускага партыйнага і савецкага дзеяча **Ждановіча Васіля Сцяпанавіча**( 1919г.). У 1965 – 1969 гг. – першы сакратар Карэліцкага райкама КПБ.

**80 год** з дня нараджэння кандыдата тэхнічных навук, **Бухаўца Міхаіла Фёдаравіча**(в. Жухавічы; 1939 г.).

**140 год** з дня нараджэння яўрэйскага  паэта **Рольніка Іосіфа**( в.В.Жухавічы; 1879г.).

**80 год** з дня нараджэння паэта **Шыбута Паўла**(в. Палужжа; 1939г.).

**95 год** з дня нараджэння партызана атрада “Кастрычнік” **Белуша Міхаіла Андрэевіча**, ур. в.Руда Ліпічанская Шчучынскага павета( жыў на тэрыторыі Карэліцкага раёна; 1924г.).

**115 год** з дня нараджэння беларускага графіка, жывапісца **Васілеўскага Мікалая Пятровіча**( пасля 1 – й Сусветнай вайны жыў на радзіме бацькоў у в.С.Слабада; 1904г.).

**120 год** з дня нараджэння камсамольца і партыйнага дзеяча, удзельніка рэвалюцыйнага руху ў Расіі, ахвяры палітычных рэпрэсій **Акуліка Міхаіла Андрэевіча**(в.Баранавічы; 1899г.).

**130 год** з дня нараджэння дзяржаўнага дзеяча Ізраіля, яўрэйскага паэта, Прэзідэнта Ізраіля, былога міністра адукацыі і культуры Ізраіля, пісьменніка, публіцыста, гісторыка літаратуры **Шазара Шнеўра Залмана**(сапр. Рубашаў Залман; г.п.Мір; 1889г.).

*Студзень*

**4 – 50 год** з дня нараджэння **Гусаковай Святланы Мікалаеўны**(нар. у 1969г.), майстра народных промыслаў, педагога, гаспадыні аграсядзібы “Светлазара” ў г.п. Мір Карэліцкага раёна, лаўрэата прэміі імя А.І.Дубко Гродзенскага аблвыканкама “За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва” ў намінацыі “Народны майстар года”(2007). Выкладае ў УА “Мірскі дзяржаўны мастацкI прафесійны тэхнічны каледж”.

**5 – 65 год** з дня нараджэння Лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР **Яроцкай Ларысы Васільеўны**( в.Палужжа, 1954г.)

**5 – 80 год** з дня нараджэння **Моката Аляксандра Міхайлавіча** (1939г., в.Вялікая Вобрына), работніка сельскай гаспадаркі, механізатара, Героя Сацыялістычнай Працы(1973). Узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі

**10 – 80 год** з дня нараджэння кандыдата гістарычных навук, дацэнта **Тананка Васіля Васільевіча**(в.Аюцавічы, 1939г.)

**12 – 80 год** з дня нараджэння правазнаўцы, юрыста **Сянюта Леаніда Якаўлевіча**(в.Лукі, 1939г.)

*Люты*

**3- 90 год** з дня нараджэння **Юшко Яўгеніі Іосіфаўны**(нар. у 1929г., в.Вялікія Жухавічы), работніка сельскай гаспадаркі, палявода, Героя Сацыялістычнай Працы(1966). Узнагароджана ордэнам Леніна.

**14 – 65 год** з дня нараджэння кандыдата фізіка – матэматычных навук **Араб’я Сяргея Міхайлавіча**(в. Вобрына, 1954г.)

*Сакавік*

**7 – 120 год** з дня нараджэнняы **Трусевіча Аляксандра Васільевіча**(1899, в. Паланая), беларускага ваеннага дзеяча, генерал – маёра артылерыі, удзельніка грамадзянскай і Вялікай

Айчыннай войнаў. Узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам Айчыннай вайны І ступені, ордэнам Чырвонай Зоркі, двума ордэнамі Чырвонага Сцяга.

**21 – 120 год** з дня нараджэння **Ільінскага Міколы**(Мікалай Канстанцінавіч; 1899, г.п.Мір), тэатральнага дзеяча, драматурга, акцёра, літаратара.

***Красавік***

**18 – 90 год** з дня нараджэння **Леановіча Івана Іосіфавіча**(нар. у 1929г., в.Цырын), беларускага вучонага ў галіне дарожнага будаўніцтва і прамысловага транспарту, доктара тэхнічных навук, прафесара, заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі Беларусі, ганаровага транспартніка і ганаровага дарожніка Беларусі, выдатніка адукацыі Беларусі, кавалера ордэнаў Айчыны ІІ і ІІІ ступені, ордэна “Знак Пашаны”.

***Май***

**4 – 220 год** з дня нараджэння **Бохвіца Фларыяна**(нар. у 1799 у г.п.Мір), беларускага асветніка, філосафа, пісьменніка.

**5 – 75 год** з дня нараджэння **Багушэвіча Аляксандра Аляксандравіча** (нар. у 1944г., в.Паланая), кандыдата сельскагаспадарчых навук, заслужанага работніка сельскай гаспадаркі.

**14 – 70 год** з дня нараджэння **Піскуна Георгія Іванавіча**(нар. у 1949г. у в.Баяры), кандыдата сельскагаспадарчых навук

**20 – 75 год** з дня нараджэння **Кікеля Паўла Васільевіча**(нар. у 1944г. у в. Браносава), беларускага філосафа, доктара філасофскіх навук, доктара матэматычных навук, дацэнта, прафесара, педагога, паэта, выдатніка адукацыі Беларусі.

**20 – 70 год** з дня нараджэння **Жука Анатоля Аляксандравіча**(нар. у 1949г. у в.Ярэмічы), беларускага артыста тэатра і кіно,

пісьменніка, кінасцэнарыста, заслужанага артыста Беларусі, лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола Беларусі(1980).



23 – **50 год** з часу ўтварэння **УК “Карэліцкі раённы краязнаўчы музей”**(1969)

**25 – 80 год** з дня нараджэння **Стомы Мікалая Андрэевіча**(нар. у 1939г. у в.Вялікія Жухавічы), беларускага мастака – плакатыста.

**25 – 70 год** з дня нараджэння **Баранавай Лідзіі Іванаўны**(нар. у 1949 г. у в. Мядзвядка), беларускага вучонага ў галіне педагогікі, дацэнта Мінскага педагагічнага універсітэта імя М.Танка.

***Чэрвень***

**4 – 80 год** з дня нараджэння **Акуліка Аляксандра Канстанцінавіча**(нар. у 1939г. у в. Баранавічы), беларускага гісторыка, кандыдата гістарычных навук, педагога, публіцыста, журналіста, лаўрэата рэспубліканскай прэміі саюза журналістаў “Залатое пяро”.

**6 – 70 год** з дня нараджэння **Бухаўца Алега Рыгоравіча**(нар. у 1949г. у в.Аюцавічы), расійскага і беларускага гісторыка, доктара гістарычных навук, прафесара.

***Ліпень***

**7 – 85 год** з дня нараджэння **Грыбок Зінаіды Паўлаўны**(нар. у 1939г. у в.Падгайна), лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР.

**9 – 80 год** з дня нараджэння **Бухаўца Аляксандра Пятровіча**(нар. у 1939г. у в. Вялікія Жухавічы), кандыдата тэхнічных навук.

**11 – 70 год** з дня нараджэння **Ламана Пятра Аляксандравіча**(нар. у 1949г. у в. Маласельцы), беларускага акцёра, празаіка, паэта. Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны.

***Верасень***

**10 – 80 год** з дня нараджэння **Яхант Алены Пятроўны**(нар. у 1939г. у в. Сянежыцы Навагрудскага раёна), беларускага мовазнаўца, педагога, краязнаўца. У 1963 – 1968 гг.. настаўнічала на Карэліччыне. З 1968 г. працавала ў СШ №4 г.Баранавічы, дзе стварыла народны літаратурна – краязнаўчы музей імя В.Таўлая.

**17** – **80 год** з дня вызвалення мястэчка Карэлічы Навагрудскага павета ад польскай акупацыі часцямі Чырвонай Арміі.

***Кастрычнік***

**3 – 95 год** з дня нараджэння **Мацко Аляксандра Мікалаевіча**(нар. у 1924г. у в. Пагарэлка), доктара гістарычных навук, прафесара.

***Снежань***

**20 – 120 год** з дня нараджэння **Царука Уладзіміра Зянонавіча**(нар. у 1899г. у в.Вялікая Вобрына), дзяржаўнага дзеяча, Героя Савецкага Саюза, аднаго з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Баранавіцкай вобласці.

**24** – **280 год** з дня нараджэння **Даленга – Хадароўскага Зарыяна Якаўлевіча**(сапр. Чарноцкі Адам, ур.в. Гайна Лагойскага раёна(з 1807г. жыў на тэрыторыі Карэліцкага раёна, нар. у 1825г.)

**28** – **75 год** з часу адкрыцця **Карэліцкай раённай бібліятэкі(**1944 г.).